ИССЛЕДОВАНИЯ СЛАВЯНСКИХ ЯЗЫКОВ

Ю. А. Петрушэўская

ПРА СФЕРУ ЎЖЫВАННЯ І ПАХОДЖАННЕ ПРЫКАЗКІ *АДНА ГАЛАВА ДОБРА, А ДЗВЕ ЛЕПШ*

Даследуюцца сфера ўжывання і паходжанне прыказкі *Адна галава добра, а дзве лепш*, якая памылкова вызначаецца ў Этымалагічным слоўніку прыказак (2014) І. Я. Лепешава як «уласна беларуская». Выяўлена, што прыказка мае інтэрнацыянальную сферу ўжывання і з'яўляецца адным з варыянтаў еўрапейскай парэміі з лагічна-семантычнай структурай «адна галава / два вокі vs. дзве галавы / чатыры вокі». Вызначана, што яна ўзыходзіць да англійскага варыянта еўрапейскай парэміі *Two heads are better than one*, першае пісьмовае ўжыванне якога фіксуецца ў XIV стагоддзі (варыянт з лагічна-семантычнай структурай «адна галава vs. дзве галовы = добра vs. Лепш», які з'яўляецца агульным для шэрагу славянскіх, германскіх і раманскіх моў). Мяркуецца, што ў беларускую мову прыказка запазычана з рускай мовы ў пачатку XX стагоддзя.

Вызначэнне паходжання і сферы функцыянавання прыказак, якія ўжываюцца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове, з'яўляецца адной з актуальных праблем беларускага мовазнаўства, у прыватнасці парэміялогіі як асобнага раздзела навукі аб мове [1, с. 44–65], і мае важнае значэнне пры размежаванні ўніверсальнага (агульнага з усімі мовамі ці пераважнай большасцю моў свету), інтэрнацыянальнага (агульнага толькі з пэўнымі мовамі) і спецыфічнага (нацыянальна-культурнага) кампанентаў у сістэме парэміялагічных адзінак беларускай мовы [2], што з'яўляецца, у сваю чаргу, яшчэ адной актуальнай праблемай не толькі беларускай парэміялогіі і афарыстыкі [3, S. 112], але і ўвогуле парэміялогіі і фразеалогіі славянскіх моў [4].

Такое размежаванне адыгрывае метадалагічна значную ролю як у лінгвістычнай тыпалогіі і ўніверсалогіі (пры параўнанні парэміялагічных сістэм беларускай і іншых моў свету [5; 6; 7; 8; 9; 10; 11]), так і ў лінгвакультуралагічным вывучэнні парэміялогіі беларускай мовы, у прыватнасці пры вызначэнні і апісанні нацыянальна-культурнай семантыкі беларускіх прыказак [12; 13], а таксама ў прыкладных мэтах пры ўкладанні парэміялагічных беларуска-іншмоўных слоўнікаў [14; 15; 16; 17; 18; 19], пры выкладанні беларускай мовы як замежнай і як няроднай ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму (у лінгвакраіназнаўчым аспекце) [20] і інш.

Мэта гэтага даследавання – акрэсліць сферу ўжывання, удакладніць паходжанне і вызначыць прыналежнасць да нацыянальна-культурнага кампанента беларускай мовы такой вядомай прыказкі, як *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей)*.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Праблема вызначэння і размежавання ўласна беларускіх і іншамоўных прыказак. Сярод прыказак, што актыўна ўжываюцца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове нямала такіх, якія маюць аналагічныя (г.зн. тоесныя па змесце і лексічна-граматычнай арганізацыі) адзінкі ў розных еўрапейскіх мовах [14;15; 16; 17; 18; 19; 21] і таму належаць да інтэрнацыянальных парэмій [22].

Многія з еўрапейскіх прыказак інтэрнацыянальнага ўжывання [23] паходзяць з класічных моў (грэчаскай ці лацінскай), у тым ліку склаліся ў выніку абагульнення зместу старажытнагрэчаскіх ці старажытналацінскіх літаратурных твораў, многія з'яўляюцца цытатамі з біблейскіх тэкстаў, альбо паходзяць з сярэднявечных лацінскіх тэкстаў, некаторыя з'яўляюцца сучаснымі парэміямі (пераважна англа-амерыканскага паходжання), якія распаўсюдзіліся ў другой палове XX стагоддзя дзякуючы імклівай глабальнай інфарматызацыі камунікацыйнай прасторы [24, р. 9–13]. Пэўная колькасць адзінак узята з вядомых літаратурных твораў або ўзыходзіць да выслоўяў аўтарытэтных дзеячаў у галіне палітыкі, культуры, навукі новага часу [25].

Разам з тым у шэрагу інтэрнацыянальных прыказак нямала такіх адзінак, якія ўзніклі ў нацыянальных еўрапейскіх мовах ці іх дыялектах і былі адлюстраваны яшчэ ў сярэднявечных парэміяграфічных крыніцах. Дакладнае паходжанне такіх прыказак вызначыць даволі цяжка, паколькі на працягу стагоддзяў свайго ўжывання і трансляцыі з адной мовы ў іншую, яны набывалі шматлікія варыянты ў розных еўрапейскіх мовах, шмат разоў перафразоўваліся ў творах нацыянальных еўрапейскіх літаратур, змянялі функцыянальную прадуктыўнасць (уваходзілі у склад актыўных адзінак, або, наадварот, набывалі адценне ўстарэласці) у тых ці іншых мовах і г.д.

Так, паходжанне некаторых інтэрнацыянальных прыказак не заўсёды дакладна тлумачыцца ў Этымалагічным слоўніку прыказак [26], які з'яўляецца першым слоўнікам такога тыпу ў славянскім мовазнаўстве [27], таму крыніцы паходжання і сфера ўжывання такога тыпу адзінак патрабуюць дадатковага вывучэння [28]. Напрыклад, прыказкі: *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей)*; *Дай божа ў добры час сказаць, а ў ліхі (нядобры) памаўчаць*; *З вялікага грому <часамі, заўсёды> малы дождж <бывае>*; *Хто мажа, той і едзе* і інш. вызначаюцца як «уласна беларускія» [26, с. 18, 39, 49, 126], аднак такімі не з'яўляюцца ні паводле паходжання, ні паводле сферы ўжывання, паколькі тоесныя па змесце і лексічна-граматычнай арганізацыі прыказкі функцыянуюць і ў іншых славянскіх і неславянскіх мовах, пры гэтым многія з такіх моў не мелі да нядаўняга часу ўвогуле кантактаў з беларускай мовай (параўн., адпаведна, у англійскай – *Two heads are better than one*, у нямецкай – *In guter Stunde soll man sprechen, in böser soll man schweigen*, у кітайскай – 雷声大雨点小, літаральна *Гром, але малы дождж* [29], у чэшскай – *Kdo maže, ten jede* і г. д.).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гэта дазваляе сумняваццa ў прыналежнасці згаданых і падобных да іх прыказак да нацыянальна-культурнага кампанента беларускай мовы. Трэба заўважыць, што іншамоўныя і агульныя для беларускай і іншых моў прыказкі могуць мець нацыянальна-культурную маркіраванасць дзякуючы наяўнасці ў семантычнай структуры, лексічна-граматычнай арганізацыі, стылістычнай афарбоўцы тых ці іншых спецыфічных (г.зн. унікальных) кампанентаў (параўн., напрыклад, у беларускай мове – *Вольнаму воля,* ***шалёнаму поле***, у рускай – *Вольному воля,* ***спасенному рай***, у беларускай мове – *Не за дзень* ***Вільня*** *станавілася,* або *Не адразу* ***Вільню*** *пабудавалі*, у рускай – ***Москва*** *не сразу строилась*, ва ўкраінскай – ***Київ*** *не відразу збудований*, у польскай – *Nie od razu* ***Kraków*** *zbudowany*, у французскай – ***Paris*** *n'a pas été bâti en un day*, у англійскай – ***Rome*** *was not built in a day*, у нямецкай – ***Rom*** *wurde auch nicht an einem Tage erbaut*, у іспанскай – *No se ganó* ***Zamora*** *en una hora*, у італьянскай – ***Roma*** *non fuit una die condita*) [12, с. 49, 30, 31].

Далёка не ўсе прыказкі, якія функцыянуюць у сучаснай беларускай літаратурнай мове і ўспрымаюцца яе носьбітамі і даследчыкамі як уласна беларускія (і інтэрпрэтуюцца на гэтай падставе як нацыянальна-культурны кампанент), ужываюцца толькі ў беларускай мове і характарызуюцца уласна беларускім паходжаннем. Гэта ж уласціва і іншым мовам свету, у якіх многія прыказкі маюць іншамоўнае паходжанне, але хутка асімілявалі ў мове-рэцыпіенце і, як правіла, не асацыіруюцца ў ёй з чужымі мовамі і культурамі. Так, паводле слушнага меркавання В. М. Макіенкі, «вопреки расхожему представлению о густо национальной маркированности идиоматики и паремиологии они – как это ни парадоксально – являются более интернациональными, чем лексика» [4, S. 2].

Дакладна высветліць, з'яўляецца тая ці іншая прыказка ўласна беларускай ці не, у якіх яшчэ мовах ужываецца і з якой менавіта мовы паходзіць, ці мае ў сваім складзе маркіраваныя нацыянальна-культурныя кампаненты ў выпадку, калі з'яўляецца агульнай для беларускай і іншых моў, можна толькі шляхам параўнальнага аналізу [30] з дапамогай структурна-семантычнага мадэлявання ў сінхранічным і ў дыяхранічным аспектах на матэрыяле розных форм існавання іншых моў свету, перш за ўсё, тых, якія мелі прамыя або апасродкаваныя кантакты з беларускай мовай на розных этапах яе гістарычнага развіцця (славянскіх, балтыйскіх, германскіх, раманскіх).

Паходжанне і сфера ўжывання прыказкі *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей)* паводле беларускай парэміяграфіі. Прыказка *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей)* у згаданым этымалагічным слоўніку прыказак вызначаецца як «уласна беларуская», што «склалася ў выніку сінекдахічнага пераносу (назва часткі ўжываецца ў значэнні цэлага: галава–чалавек)» і ўжываецца ў выпадках, «калі лічаць, што лепш параіцца з кім-небудзь, чым рашаць справу аднаму» [26, с. 18].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Прыказка зафіксавана ў некалькіх парэміялагічных зборніках другой паловы XX стагоддзя ў розных варыянтах: *Адна галава – добра, а дзве яшчэ лепей* у рукапісным зборы (1945–1975) А. Л. Гарошкі [32, с. 274]; *Адна галава добра, а дзве яшчэ лепей* – Я. Рапановіча (1958, 2-е выд. 1974), дзе змяшчаецца чамусьці ў раздзеле «Дакастрычніцкія прыказкі і прымаўкі» [33, с. 11]; *Адна галава добра, а дзьве яшчэ лепі* – у дадатку да зборніка А. Варлыгі (1966) [34], змешчанага ў слоўніку А. С. Аксамітава [32, с. 16]; *Адна галава – добра, дзве – лепш, але хай адна разважыць і наважыць* – М. Я. Грынблата (1976) са спасылкай на зборнік Ф. М. Янкоўскага (1962) [35, кн. 2, с. 39]; *Адна галава – добра, а дзве – яшчэ лепш* – В. І. Рабкевіча (1985) [36, с. 18]; *Галава добра, а дзве лепш* – З. Ф. Санько (1991) [19, с. 44] і інш. Не фіксуецца прыказка ні ў адной з беларускіх парэміяграфічных прац XIX – першай паловы XX стагоддзя, у тым ліку і ў такіх значных па аб'ёму крыніцах, як зборнікі І. І. Насовіча (1874), Я. А. Ляцкага (1898), А. К. Сержпутоўскага (1908), М. Федароўскага (1935) і інш. [37; 38; 39; 40].

Трэба заўважыць, што пры парэміяграфічным апісанні прыказкі не абышлося і без недарэчнасцей. Так, у зборніку М. Я. Грынблата прыказка *Адна галава – добра, дзве – лепш, але хай адна разважыць і наважыць* прыводзіцца са спасылкай на другое выданне вядомага зборніка Ф. М. Янкоўскага «Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы» (1957, 2-е выд. 1962) [41], дзе, аднак, такая адзінка адсутнічае. Няма яе і ў трэцім, дапрацаваным і дапоўненым выданні (1992) зборніка Ф. М. Янкоўскага [42].

Прыказка адлюстравана ва ўсіх тлумачальных парэміяграфічных слоўніках беларускай мовы – Р. В. Шкрабы і І. Р. Шкраба (1987) [43, с. 26], І. Я. Лепешава і М. А. Якалцэвіч (1996, 2-е выд. 2002; 2011) [44, с. 47; 45, с. 64], а таксама А. С. Аксамітава (2000, 2-е выд. 2002), паводле зборнікаў А. Варлыгі (1966) і А. Л. Гарошкі [32, с. 16, 274]. Ілюстрацыйныя цытаты, што прыводзяцца ў тлумачальных слоўніках, узятыя ў асноўным з мастацкіх твораў пасляваеннага часу (толькі адна цытата паходзіць з п'есы І. Гурскага «Новы горад», пастаўленай у 1931 г.).

Ва ўсіх трох тлумачальных слоўніках не адзначаецца стылістычных асаблівасцей ужывання прыказкі. Семантызуецца прыказка ў кожным слоўніку крыху па-рознаму (што дэтэрмінавана адсутнасцю распрацаванай і агульнапрынятай метамовы апісання парэміялагічнай семантыкі), аднак усе тлумачэнні маюць адзін і той жа агульны змест: «Лепш / трэба параіцца з кім-небудзь / прыслухацца да парады каго-небудзь, чым рашаць справу аднаму».

Гэта ўсё сведчыць пра тое, што прыказка *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей)*, па-першае, фіксуецца ў беларускай мове не раней за пачатак XX стагоддзя, па-другое, яна пачала шырока ўжывацца ў сучаснай беларускай мове не раней за сярэдзіну XX стагоддзя, і, па-трэцяе, не мае семантычнай і стылістычнай дыферэнцыяцыі ў беларускай літаратурнай мове.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Тоесныя па змесце і аналагічныя ці блізкія па форме прыказкі ў іншых еўрапейскіх мовах. Паводле іншамоўных парэміяграфічных крыніц другой паловы XX стагоддзя, у рускай мове ўжываецца прыказка *Одна голова хорошо, а две лучше* [46, с. 188], якая з'яўляецца адным з найболей прадуктыўных прататыпаў рускіх антыпрыказак, што сведчыць пра яе агульнавядомасць і шырокую ўжывальнасць [47, с. 105–106; 48, с. 61–63]. Ва ўкраінскай – *Одна голова добре, а дві ще краще* [21, с. 162], што шырока не ўжываецца, але мае агульную вядомасць [21, с. 334]. У англійскай – *Two heads are better than one* (літаральна *Дзве галавы лепш, чым адна*) [49, prov. 702], якая актыўна парадыруецца ў шматлікіх антыпрыказках, што з'яўляецца паказчыкам яе агульнавядомасці і шырокай ўжывальнасці [50, p. 220–221]. У французскай – *Deux têtes valent mieux qu'une* (літаральна *Дзве галавы лепш, чым адна*) [51, p. 138] і г.д. Акрамя гэтага ва ўкраінскай мове існуе вельмі блізкая па форме прыказка *Що голова – то розум, а дві – краще* [52, с. 41], у польскай – *Co dwie głowy, to nie jedna* (літаральна *Што дзве галавы – то не адна*) [53, s. 63], у літоўскай – *Dvi galvos – tai ne viena* (літаральна *Дзве галавы – гэта не адна*) [54, с. 118] і г.д.

Зразумела, што ў л а с н а б е л а р у с к а я п р ы к а з к а за такі адносна кароткі прамежак часу (на працягу першай паловы XX стагоддзя) не магла трапіць адразу ў столькі розных моў, стаць у іх агульнавядомай, набыць шырокую ўжывальнасць, розныя нацыянальныя варыянты і шматлікія парадыйныя перафразаванні. Не мог у дадзеным выпадку быць задзейнічаны і фактар выпадковасці, калі ў розных мовах незалежна адна ад адной узнікаюць блізкія па змесце і форме адзінкі, таму што гэты фактар аб'ектыўны толькі ў выпадках адсутнасці або істотнай абмежаванасці кантактаў (у тым ліку і непрамых) паміж дадзенымі мовамі. Можна меркаваць аб верагоднасці запазычання прыказкі з беларускай мовы ў рускую ці ўкраінскую мову (праз рускую) з прычыны адзінай камунікацыйнай прасторы на працягу XIX і XX стагоддзяў, нават пра магчымасць пранікнення прыказкі ў польскую ці ў літоўскую мову, аднак трансляцыя беларускай прыказкі ў англійскую і французскую мовы не мае аб'ектыўнага тлумачэння.

Ужываюцца таксама тоесныя па змесце прыказкі з іншым вобразам у польскай мове *Cztery oczy więcej widzą aniżeli dwa* (літаральна *Чатыры вокі болей бачаць, чым два*) [55, s. 27]; *Dwa więcej ujrzą niż jeden* (літаральна *Двое больш убачаць, чым адзін*) [55, s. 215]; у нямецкай – *Vier Augen sehen mehr (besser) als zwei* (літаральна *Чатыры вокі лепш бачаць, чым два*) [56, S. 66]; *Zwei sehen mehr als einer* (літаральна *Двое бачаць больш, чым адзін*) [57, S. 679]; у чэшскай – *Více očí více vidí* (літаральна *Больш вачэй болей бачыць*) [58, S. 83]; у лацінскай – *Oculi plus vident quam oculus* (літаральна *Вочы больш бачаць, чым вока*) [58, S. 83] і г.д.

Усе згаданыя парэміялагічныя адзінкі мэтазгодна лічыць рознымі нацыянальнымі варыянтамі адной і той жа, агульнай для еўрапейскіх моў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(інтэрнацыянальнай) прыказкі з лагічна-семантычнай структурай «адна галава / два вокі vs. дзве галавы / чатыры вокі», паколькі ўсе яе варыянты маюць адно і тое ж агульнае значэнне ‘Двое разумеюць / бачаць больш / лепш, чым адзін’, таму ‘Лепш / трэба параіцца з кім-небудзь / прыслухацца да парады каго-небудзь, чым вырашаць нешта аднаму’. Паводле вобразнай структуры сярод мноства розных варыянтаў прыказкі можна вылучыць два яе асноўных лагічна-семантычных інварынты: (1) «адна галава vs. дзве галавы» і (2) «два вокі vs. чатыры вокі». У сваю чаргу, у межах першага інварыянта вылучаецца лагічна-семантычны варыянт «адна галава vs. дзве галовы = добра vs. лепш», які з’яўляецца агульным для беларускай, рускай, украінскай, англійскай, французскай моў.

На гэтай падставе можна сцвярджаць, што прыказка *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей)*, па-першае, інтэрнацыянальная паводле сферы ўжывання (функцыянуе ў мовах розных моўных груп); па-другое, не мае ўласна беларускага паходжання; па-трэцяе, з’яўляецца ў беларускай мове адным з шматлікіх нацыянальных варыянтаў інтэрнацыянальнай еўрапейскай прыказкі з лагічна-семантычнай структурай «адна галава / два вокі vs. дзве галавы / чатыры вокі»; па-чацвёртае, не мае ў беларускай мове спецыфічных (унікальных) семантычных, лексічна-граматычных, стылістычных кампанентаў.

Паходжанне інтэрнацыянальнай прыказкі *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей).* Варыянт інтэрнацыянальнай прыказкі з такой лагічна-семантычнай структурай, як «адна галава vs. дзве галовы = добра vs. лепш» вельмі актыўна функцыянуе (уваходзіць у склад 800 найбольш ужывальных прыказак) і перафразіруецца ў сучаснай англійскай мове, параўн.: *The got a problem on my mind, Harry. Give me the benefit ot your advice, will you? Two heads are better than one. As long as you don’t mean “Two fools are better than one”!* [49, prov. 702]. Таксама параўн.: “*Eurokillers*” (1979): “*Two heads are better than one… I’d value your advice*” (XVIII) [59, p. 337] і г.д.

Найбольш ранняе ўжыванне прыказкавага інварыянта «адна галава vs. дзве галавы» зафіксавана таксама ў англійскай мове. Ён сустракаецца ў адным са знакамітых твораў старажытнай англійскай літаратуры – паэме «Confessio Amantis» (1390) Джона Гаўэра (John Gower, 1325?–1408): *Bot theragein the conseil seide That thei be noght excused so, For he is on and thei ben tuo, And* ***tuo han more wit then on****, So thilke excusement was non* (Book I, The Tale of Mundus and Paulina, 1018–1022). Прыказкавы варыянт “адна галава vs. дзве галовы = добра vs. лепш” ужываецца ў англійскай мове з сярэдзіны XVI стагоддзя (параўн. «*Dialogue of Proverbs*» (1546): *But of these two thynges he wolde determyne none Without ayde. For* ***two hedds are better than one*** (I, IX, C2V); «Nabob» (1778): *Here comes brother Thomas;* ***two heads are better than one****; let us take his opinion* (I, 5) [59, p. 337] і г.д.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Можна меркаваць, што такі варыянт інтэрнацыянальнай прыказкі, які мае лагічна-семантычную структуру «адна галава vs. дзве галовы = добра vs. лепш», упершыню ўвасобіўся, відаць, у старадаўняй англійскай прыказцы *Two heads are better than one*, першае пісьмовае ўжыванне якой фіксуецца яшчэ ў XIV стагоддзі, і якая пасля ў розныя часы трапіла ў іншыя мовы (французскую, рускую, беларускую, украінскую і інш.).

Мова-крыніца беларускай прыказкі *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей).* Пытанне, з якой менавіта мовы (рускай, украінскай, англійскай, фран-цузскай ці інш.) была запазычана інтэрнацыянальная прыказка ў сучасную беларускую мову, з'яўляецца найбольш складаным.

Трэба заўважыць, што ні ў польскай, ні ў рускай мове, якія аказалі найбольшы ўплыў на гістарычнае развіццё беларускай мовы, у тым ліку на фарміраванне яе парэміялагічнага фонду, варыянт прыказкі з такой самай лагічна-семантычнай структурай, як у беларускай мове («адна галава vs. дзве галовы = добра vs. лепш»), не зафіксаваны раней XX стагоддзя.

Так, яе няма (як і згаданай вышэй прыказкі *Co dwie głowy, to nie jedna*) у польскім фундаментальным парэміялагічным зборы (1889–1894) С. Адальберга, дзе падаецца некалькі іншых нацыянальных варыянтаў інтэрнацыянальнага інварыянта з лагічна-семантычнай структурай «адна галава vs. дзве галавы»: *Lepiej dwie głowie rozumieją, niżli jedna*; *W dwóch głowach więcej rozumu, niż w jednej*; а таксама тоесная па значэнню і блізкая па форме старажытная прыказка *Rychlej sobie dwie poradzą głowie*, якая вядома з пачатку XVII стагоддзя [60, s. 140, 142].

У рускай мове прыказка *Одна голова хорошо, а две лучше* фіксуецца толькі ў другой палове XX стагоддзя ў парэміялагічным зборніку (1988) пад рэдакцыяй У. П. Анікіна [46; 61]. Надзвычай высокая функцыянальная актыўнасць прыказкі, пра што згадвалася вышэй, з'яўляецца вынікам дынамічных працэсаў у парэміялагічным фондзе сучаснай рускай мовы, абумоўленых, па-першае, дзеяннем закона моўнай эканоміі, а па-другое, асаблівасцямі ўнутранай арганізацыі парэміялагічнай падсістэмы мовы, калі з некалькіх цалкам сінанімічных прыказак звычайна застаецца ў актыўным ужыванні толькі адна. Так, тоесная па значэнні старажытная руская прыказка *Ум хорошо, а два лучше* [46, с. 927], якую, дарэчы, можна разглядаць, як варыянт яшчэ адной, агульнай для ўсіх згаданых парэміялагічных адзінак інтэр-нацыянальнай прыказкі з лагічна-семантычнай структурай «розум / галава / вочы аднаго чалавека vs. розум / галава / вочы двух і больш чалавек», выйшла з актыўнага ўжывання ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя, пра што сведчыць амаль поўная адсутнасць яе парадыйных і жартоўных перафразаванняў у сучаснай рускай мове [47, с. 508–509; 48, с. 311–312].

Гэта дазваляе меркаваць, што варыянт інтэрнацыянальнай прыказкі з такой лагічна-семантычнай структурай, як «адна галава vs. дзве галовы = добра vs. лепш» трапіў у рускую мову непасрэдна з англійскай мовы ў другой

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

палове XIX – першай палове XX стагоддзя. Гэтаму, дарэчы, маглі садзейнічаць рускамоўныя пераклады твораў англійскай літаратуры XIX стагоддзя. Так, прыказка *Two heads are better than one* сустракаецца, у прыватнасці, у знакамітым рамане «Rob Roy» (1817) Вальтэра Скота (Walter Scott, 1771–1832): *Francis .. was likely to be as effectually .. supported by my presence than by yours.* ***Two heads are better than one****, you know* (I, VIII). Раман адразу пасля выдання набыў вялікую папулярнасць і даволі хутка быў перакладзены на розныя мовы, у тым ліку і на рускую (1829), у якую з гэтага твора, відаць, і быў скалькаваны англійскі варыянт інтэрнацыянальнай прыказкі.

На гэтай падставе можна лічыць, што ў сучасную беларускую мову прыказка была запазычана з рускай, хутчэй за ўсё, у пачатку XX стагоддзя і на той час ўжывалася пераважна ў вусным маўленні разам з сінанімічнай ёй прыказкай *Ум хорошо, а два лучше*. Не варта выключаць і магчымасць прамой трансляцыі прыкладна ў гэты ж час прыказкі *Two heads are better than one* з англійскай мовы ў беларускую ў выглядзе інтэртэксту з англамоўных мастацкіх ці публіцыстычных твораў. У такім выпадку калька з англійскай мовы *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей)* пачала ўжывацца ў пісьмовым маўленні, але дастаткова хутка трапіла і ў гутарковую мову.

Такім чынам, прыказка *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей)* фіксуецца ў беларускай мове з пачатку XX стагоддзя, але шырока ўжывацца ў сучаснай беларускай мове пачала толькі з сярэдзіны XX стагоддзя. Яна мае інтэрнацыянальную сферу ўжывання (у розных мовах некалькіх моўных груп індаеўрапейскай моўнай сям'і – балтыйскіх, германскіх, раманскіх, славянскіх) і з'яўляецца ў беларускай мове адным з нацыянальных варыянтаў інтэрнацыянальнай еўрапейскай парэміялагічнай адзінкі з лагічна-семантычнай структурай «адна галава / два вокі vs. дзве галавы / чатыры вокі». Прыказка мае іншамоўнае паходжанне і ўзыходзіць, відаць, да англійскага варыянта інтэрнацыянальнай прыказкі *Two heads are better than one*, першае пісьмовае ўжыванне якога фіксуецца яшчэ ў XIV стагоддзі і які пасля ў другія часы рознымі шляхамі трапіў у іншыя еўрапейскія мовы (варыянт «адна галава vs. дзве галовы = добра vs. лепш», які з'яўляецца агульным для беларускай, рускай, украінскай, англійскай, французскай моў). У беларускую мову прыказка прыйшла, хутчэй за ўсё, у пачатку XX стагоддзя з рускай мовы.

Прыказка *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей)* не ўваходзіць у нацыянальна-культурны кампанент парэміялагічнай сістэмы беларускай мовы, паколькі не належыць да адзінак уласна беларускага паходжання, не мае ў сваім складзе нацыянальна маркіраваных лексічных і граматычных элементаў і не характарызуецца ў беларускай мове адметнай семантыкай ці стылістычнымі асаблівасцямі.

Высвятленне іншамоўнага паходжання і інтэрнацыянальнай сферы ўжывання прыказкі *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей)*, якая ўспрымаецца як уласна беларуская і носьбітамі, і даследчыкамі беларускай мовы, *не з'яўляецца адзіным выпадкам*. Перспектывай далейшага даследавання павінна стаць удакладненне паходжання і сферы ўжывання ўсіх

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прыказак, якія не вызначаюцца ў беларускім мовазнаўстве як іншамоўныя і шырока ўжываюцца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове, на падставе іх параўнання з парэміялагічнымі адзінкамі розных моў свету і структурна-семантычнага мадэлявання на шырокім моўным фоне ў сінхранічнай і дыяхранічнай перспектывах.

ЛІТАРАТУРА

1. *Лепешаў, І. Я.* Парэміялогія як асобны раздзел мовазнаўства : дапаможнік / І. Я. Лепешаў. – Гродна : ГрДУ імя Янкі Купалы, 2006. – 279 с.
2. *Петрушевская, Ю. А.* Интернациональные, заимствованные и исконно языковые единицы в составе паремиологического фонда современного белорусского языка / Ю. А. Петрушевская // Вестник Новгородского гос. ун-та. Сер. «Филологические науки». – 2014. – № 77. – С. 123–126.
3. *Иванов, Е. Е.* Белорусская паремиология и афористика в общеевропейском контексте (актуальные проблемы изучения) / Е. Е. Иванов // Nationales und Internationales in der slawischen Praseologie = Национальное и интернациональное в славянской фразеологии : XV Международный съезд славистов, г. Минск, 20–27 августа 2013 г. / Internationales Slawistenkomitee, Phraseologische Kommission ; Hrsg. H. Walter, V. M. Mokienko. – Greifswald : E.M.A.-Universität, 2013. – S. 111–116.
4. Nationales und Internationales in der slawischen Praseologie = Национальное и интернациональное в славянской фразеологии : XV Международный съезд славистов, г. Минск, 20–27 августа 2013 г. / Internationales Slawistenkomitee, Phraseologische Kommission ; Hrsg. H. Walter, V. M. Mokienko. – Greifswald : E.M.A.-Universität, 2013. – 276 S.
5. *Иванов, Е. Е.* Различия в семантике и структуре белорусских и английских пословиц / Е. Е. Иванов, Ю. А. Петрушевская // Актуальные проблемы преподавания иностранных языков в высшей школе Республики Беларусь: сб. науч. статей / под ред. Е. Е. Иванова. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2011. – С. 213–215.
6. *Иванов, Е. Е.* Типы межъязыковых сходств и различий паремиологических единиц (на материале белорусского и немецкого языков) / Е. Е. Иванов, Н. К. Романова // Acta Albaruthenica, Rossica, Polonica – VII : зб. навук. артыкулаў / пад рэд. Г. М. Мезенка. – Віцебск : Выд-ва ВДУ імя П. М. Машэрава, 2006. – С. 161–164.
7. *Іваноў, Я. Я.* Парэміялагічныя сістэмы беларускай і рускай моў : падабенствы і разыходжанні / Я. Я. Іваноў // Філалогічні студії : наук. віс. Кривор. держ. пед. ун-ту. – 2011. – Вип. 6. – Ч. 2. – С. 53–63.
8. *Іваноў, Я. Я.* Прыказкі і антыпрыказкі ў беларускай і іншых славянскіх і неславянскіх мовах / Я. Я. Іваноў // Славянские народы и их культуры : традиция и современность : сб. науч. статей / редкол.: В. И. Коваль (отв. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ имени Ф. Скорины, 2013. – С. 137–139.
9. *Іваноў, Я. Я.* Прынцыпы супастаўляльнага апісання афарыстычнай парэміялогіі беларускай і рускай моў / Я. Я. Іваноў // Studia sławistyczne. – 2003. – Т. 4. – S. 49–55.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

10. *Іваноў, Я. Я.* Семантычная тыпалогія афарызма ў славянскіх і германскіх мовах / Я. Я. Іваноў // Frazeologické štúdie III : k 13. kongresu slavistov v L'ubl'ane / Komisia pre výskum frazeológie pri Slovenskom komitéte slavistov, Jazykovedný ústav L'udovíta Štúra Slovenskej akadémie vied; ed. J. Mlacek, P. Ďurčo. – Bratislava : STIMUL, 2003. – S. 43–60.
11. *Петрушевская, Ю. А.* Универсальное и национальное в паремиологической системе языка (на материале английского и белорусского языков) / Ю. А. Петрушевская // Даследаванні па германскай і славянскай філалогіі = Acta Germano-Slavica : зб. навук. артыкулаў / пад рэд. Я. Я. Іванова. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2015. – Вып. 6. – С. 213–216.
12. *Іваноў, Я. Я.* Нацыянальна-культурная семантыка беларускай мовы і праблема яе лінгвакраіназнаўчай рэпрэзентацыі (на матэрыяле моўнай афарыстыкі) / Я. Я. Іваноў // Сацыякультурная прастора мовы (сацыяльныя і культурныя аспекты вывучэння беларускай мовы) / С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў, Н. Б. Мячкоўская. – Мінск : Веды, 1998. – С. 33–62.
13. *Іваноў, Я. Я.* Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў : лінгвакраіназнаўчы дапаможнік / Я. Я. Іваноў, С. Ф. Іванова. – Мінск : Беларускі фонд Сораса, 1997. – 262 с. – («Абнаўленне гуманітарнай адукацыі ў Беларусі»).
14. *Ганчарова, Н. А.* Proverbia et dicta : шасцімоўны слоўнік прыказак, прымавак і крылатых слоў / Н. А. Ганчарова, Л. Г. Калядка, Ш. М. Шчарбакова [і інш.] ; пад рэд. Н. А. Ганчаровай. – Мінск : Універсітэцкае, 1993. – 255 с.
15. *Иванов, Е. Е.* Русско-белорусский паремиологический словарь / Е. Е. Иванов, В. М. Мокиенко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2007. – 242 с.
16. *Іваноў, Я. Я.* Англа-беларускі парэміялагічны слоўнік = English-Belarusian Paremiological Dictionary / І. С. Дубасава, Я. Я. Іваноў, Н. П. Пятрова [і інш.]; пад рэд. Я. Я. Іванова. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2009. – 240 с.
17. *Іваноў, Я. Я.* Беларуска-нямецкі парэміялагічны слоўнік = Belarussisches-Deutsch paremiologisches Wörterbuch / Я. Я. Іваноў, Н. К. Раманава. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2006. – 108 с.
18. *Іваноў, Я. Я.* Польска-беларускі парэміялагічны слоўнік = Polsko-białoruski słownik paremiologiczny / Я. Я. Іваноў [і інш.] ; прад. і ўступ. артыкул Я. Я. Іванова. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2007. – 192 с.
19. *Санько, З. Ф.* Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем / З. Ф. Санько. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 218 с.
20. *Іваноў, Я. Я.* Нацыянальна-культурная семантыка беларускай мовы як аб'ект лінгвакраіназнаўства (пры вывучэнні беларускай мовы як замежнай і як другой ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму) / Я. Я. Іваноў // Беларуская мова : шляхі развіцця, кантакты, перспектывы : м-лы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый», г. Мінск, 21–25 мая, 4–7 снежня 2000 г. / UNESCO, ГА «Міжнародная асацыяцыя беларусістаў», Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф. Скарыны; рэдкал. : Г. Цыхун (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. – С. 285–290. – («Беларусіка = Albaruthenica". – Кн. 19).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

21. *Котова, М. Ю.* Русско-славянский словарь пословиц с английскими соответствиями / М. Ю. Котова. – СПб. : Изд-во СПбГУ, 2000. – 360 с.
22. *Paczolay, G.* European Proverbs in 55 Languages, with Equivalents in Arabic, Persian, Sanskrit, Chinese, and Japanese / G. Paczolay. – Veszprém (Hungary) : Veszprémi Nyomda, 1997. – 528 p.
23. *Strauss, E.* Dictionary of European proverbs : 3 vols / E. Strauss. – London & New York : Routledge, 1994. – Vol. 1. – XIII, 625 p. ; Vol 2. – 627–1232 p. ; Vol. 3. – 789 p.
24. *Mieder, W.* Proverbs : A Handbook / W. Mieder. – Westport, CT : Greenwood Press, 2004. – 304 p.
25. *Іваноў, Я. Я.* Крылатыя афарызмы ў беларускай мове: з іншамоўных літаратурных і фальклорных крыніц VIII ст. да н. э. – XX ст. : тлумачальны слоўнік / Я. Я. Іваноў. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2011. – 164 с.
26. *Лепешаў, І. Я.* Этымалагічны слоўнік прыказак / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Выш. шк., 2014. – 141 с.
27. *Петрушкевіч, А. М.* Першы этымалагічны слоўнік прыказак – беларускі / А. М. Петрушкевіч // Роднае слова. – 2014. – № 5. – С. 52.
28. *Петрушэўская, Ю. А.* Паходжанне і тэкставыя крыніцы некаторых універсальных прыказак у сучаснай беларускай мове / Ю. А. Петрушэўская // Текст. Язык. Человек : сб. науч. трудов : в 2 ч. / редкол.: С. Б. Кураш (отв. ред.) [и др.]. – Мозырь : МГПУ имени И. П. Шамякина, 2015. – Ч. 1. – С. 95–96.
29. Гром [Электронный ресурс] // Китайский онлайн-словарь. – 2015. – Режим доступа : bkrs.info/slovo.php?ch=гром – Дата доступа : 25.05.2015.
30. *Іваноў, Я. Я.* Параўнальнае мовазнаўства і нацыянальна-культурная семантыка мовы (на матэрыяле парэміялагічных адзінак) / Я. Я. Іваноў // Нацыянальная мова і нацыянальная культура : аспекты ўзаемадзеяння : зб. навук. артыкулаў / рэдкал.: Д. В. Дзятко (адк. рэд.), П. А. Міхайлаў, В. В. Урбан [і інш.]. – Мінск : БДПУ імя Максіма Танка, 2009. – С. 54–57.
31. *Іваноў, Я. Я.* Семантыка беларускіх афарызмаў / Я. Я. Іваноў // Известия Гомельского гос. ун-та имени Ф. Скорины. – 2000. – № 2 (25). – С. 94–99.
32. *Аксамітаў, А. С.* Прыказкі і прымаўкі: тлумачальны слоўнік беларускіх прыказак і прымавак з архіваў, кафедральных збораў, рэдкіх выданняў XIX і XX стагоддзяў / А. С. Аксамітаў ; пад рэд. Я. Янушкевіча. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 320 с.
33. *Рапановіч, Я. Н.* Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі / склад. Я. Н. Рапановіч. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1974. – 384 с.
34. *Варлыга, А.* Прыказкі Лагойшчыны = Proverbs of Lahojsk : зборнік народных прыказак / запісаў А. Варлыга ; уступ. арт. Р. Максімовіч ; Беларускі інстытут навукі й мастацтва. – Нью-Ёрк ; Мюнхен : Выданьне фундацыі імя Пётры Крэчэўскага, 1966. – 112 с.
35. Прыказкі і прымаўкі : у 2 кн. / склад. М. Я. Грынблат. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 559 с. ; Кн. 2. – 616 с.
36. *Рабкевіч, В. І.* Паслухай, што людзі кажуць : беларускія народныя прыказкі, прымаўкі, прыкметы, жарты / В. І. Рабкевіч. – Мінск : Мастац. літ., 1985. – 270 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

37. *Касько, У. К.* Палескі дзівасіл : беларускія народныя прыказкі, прымаўкі, выслоўі : са скарбніцы А. К. Сержпутоўскага / У. К. Касько. – Мінск : Выш. шк., 2005. – 383 с.
38. *Ляцкій, Е. А.* Матеріалы для изученія творчества и быта белоруссовъ. I. Пословицы, поговорки, загадки / Е. А. Ляцкій. – М., 1898. – VII, 63 с. – (Чтенія въ Императорскомъ Обществе исторіи и древностей Россійскихъ при Московскомъ университете. Кн. 3).
39. Носовичъ, И. И. Сборникъ белорусскихъ пословицъ / И. И Носовичъ. – СПб. : Типографія Императорской Академіи Наукъ, 1874. – VI, 232, 18 с. – (Сборникъ Отделенія русскаго языка и словесности Императорской Академіи Наукъ. Т. XII, № 2).
40. *Federowski, M.* Lud białoruski na Rusi Litewskiej : materjały do etnografji słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1905 : T. I–IV / M. Federowski. – Warszawa : Towarzystwo naukowe Warszawskie, 1935. – T. IV : Przysłowia, żarciki, wyrażenia stałe [etc]. – XVIII, 490 s.
41. *Янкоўскі, Ф. М.* Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склаў Ф. М. Янкоўскі. – 2-е выд., дап. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1962. – 556 с.
42. *Янкоўскі, Ф. М.* Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склаў Ф. М. Янкоўскі. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.
43. *Шкраба, І. Р.* Крынічнае слова : беларускія прыказкі і прымаўкі / І. Р. Шкраба, Р. В. Шкраба ; прад. і ўступ. артыкул Р. В. Шкрабы. – Мінск : Мастац. літ., 1987. – 286 с.
44. *Лепешаў, І. Я.* Слоўнік беларускіх прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 511 с.
45. *Лепешаў, І. Я.* Тлумачальны слоўнік прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – Гродна : ГрДУ, 2011. – 695 с.
46. *Мокиенко, В. М.* Большой словарь русских пословиц / В. М. Мокиенко, Т. Г. Никитина, Е. К. Николаева. – М. : ОЛМА Медиа Групп, 2010. – 1024 с.
47. *Мокиенко, В. М.* Антипословицы русского народа / В. М. Мокиенко, Х. Вальтер. – СПб. : Нева, 2005. – 576 с.
48. *Мокиенко, В. М.* Прикольный словарь (антипословицы и антиафоризмы) / В. М. Мокиенко, Х. Вальтер. – СПб. : Нева, 2006 . – 384 с.
49. *Ridout, R.* English Proverbs Explained / R. Ridout, C. Witting. – London : Pan Books LTD, 1969. – 223 p.
50. *Mieder, W.* Twisted Wisdom : Modern Anti-Proverbs / W. Mieder, A. T. Litovkina. – Burlington : The University of Vermont, 2002. – 260 p.
51. *Bulman, F.* Dictionnaire des proverbes anglais-français, français-anglais = English-French, French-English Dictionary of Proverbs / F. Bulman. – Les Presses de l'Université Laval, 1998. – 270 p.
52. Пословица не мимо молвится = Нема приповідки без правди : російські прислів'я та приказки з українськими відповідниками / укл. Н. Бєленькова. – 2-е вид., випр. й доп. – Київ : Дніпро, 1969. – 246 с.
53. Mała księga przysłów polskich / pod red. S. Nyczaja. – Radom : Oficyna Wydawnicza STON I, 1996. – 273 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

54. *Воробьева, Л. Б.* Устойчивые выражения с компонентом ‘голова’ в русском и литовском языках / Л. Б. Воробьева // Вестник Псковского гос. ун-та. Сер. «Соц.-гуманитар. и психол.-пед. науки». – 2014. – № 4. – С. 116–119.
55. *Wójcik, A.* Słownik przysłów niemiecko-polski, polsko-niemecki / A. Wójcik, H. Ziebart. – Warszawa : Wiedza Powszechna, 2001. – 547 S.
56. *Frey, C.* Deutsche Sprichwörter für Ausländer / C. Frey, A. Herzog, A. Michel, R. Schütze. – 9. unveränd. Aufl. – Leipzig : VEB Verlag Enzyklopädie, 1988. – 123 S.
57. *Beyer, H.* Sprichwörterlexikon : Sprichwörter und sprichwörtliche Ausdrücke aus deutschen Sammlungen vom 16. Jahrhundert bis zur gegenwart / H. Beyer. – 2, unv. Aufl. – Leipzig : Bibliographisches Institut, 1985. – 712 S.
58. Sprichwörter. Proverbs. Poslovicy : Sprichwörter, ausgew. u. zusammengestellt a.d. Grundlage eines Manuskripts v. Richard Schmelz. – Berlin : Volk und Wissen Verlag, 1990. – 124 S.
59. The Concise Oxford Dictionary of Proverbs. – Oxford University Press, 2003. – 364 p.
60. *Adalberg, S.* Księnga przysłów, przypowieści i wyrażeń przysłowiowych polskich / S. Adalberg. – Warszawa : Druk E. Skiwskiego, 1889–1894. – XVIII, 31 [32], 805 s.
61. Русские пословицы и поговорки / сост. Ф. М. Селиванов, Б. П. Кирдан, В. П. Аникин ; под ред. В. П. Аникина ; предисл. В. П. Аникина. – М. : Худож. лит., 1988. – 431 с.

The article deals with the scope and origin of the proverb *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей),* which is improperly determined as "native Belarusian one" in "Etymological dictionary of proverbs" (2015) by I.Ya. Lepeshev. It was found that the proverb has an international scope, it is of foreign origin and probably dates back to the English variant of the international proverb *Two heads are better than one*. The proverb was borrowed from Russian into the modern Belarusian language at the beginning of the XX century.

Поступила в редакцию 27.07.2015

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова